На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб Колас

Народная Воля

№ 172 (524)
Серада, 23 верасня 1998 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць —
5 разоў у тыдзень

Кошт: у кіёсках і крамах — 4000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

Пик борьбы за урожай-98 в Беларуси: на бульбу брошены все — глава Администрации президента Михаил Мясникович, председатель правительства Сергей Линг, вице-премьер Леонид Козик и другие официальные лица

Официально

Владимир Гаркун подал в отставку

Президент Беларуси Александр Лукашенко, находясь в Несвиже, заявил, что вице-премьер страны Владимир Гаркун, курирующий аграрный сектор, подал в отставку. По словам главы белорусского государства, причиной ухода стало ухудшение состояния здоровья министра.

Комментируя данный факт, Александр Лукашенко отметил, что в настоящее время подыскивается кандидатура на это вакантное место в белорусском правительстве. Как сказал президент, необходимо найти "системного" человека, который сумел бы в комплексе оценить задачи, стоящие перед аграрным сектором республики.

Факт

Сообщение о среднемесячной зарплате

Министерство статистики и анализа Республики Беларусь сообщает, что средняя начисленная заработная плата рабочих и служащих в августе 1998 года составила 4 682 736 рублей (в июле 1998 года была 4 620 084 рубля) и возросла по сравнению с августом 1997 года в 1,9 раза.

БелТА

Комментарий

Вам вдвое лучше, вам лучше, лучше...

Минстат Беларуси считает, фиксирует, подбивает бабки и гипнотизирует: вам вдвое лучше, вам лучше, лучше... Не учреждение, а фабрика грез, причем уже покруче голливудской. Цифры, добытые ведомством, впечатляют, вдохновляют и радуют. Они свидетельствуют, что нынешним августом рабочий и служилый люд республики в среднем получал без скольких-то там сотен тысяч аж 5 миллионов "зайчиков", тогда как еще год назад — почти вдвое меньше, всего около 2,5 миллиона.

Вывели многоопытные статистики среднюю зарплату, сопоставили с прошлогодней, и все, и хватит. Только не надо анализа, потому что он разрушит картину процветания. Властям это не надо, а мы прикинем, хотя бы приблизительно. В августе 1997 года, когда 1 доллар стоил в пределах 30 тысяч белорусских рублей, средняя зарплата тянула этак долларов на 70. В августе 1998 года, когда за 1 доллар на "черном рынке" требовали и по 110 тысяч "зайчиков", средняя зарплата оборачивалась в сумму чуть более 40 долларов.

Вам лучше? Должно быть, лучше, хотя обеднели на добрую треть. Зато, по мнению Министерства статистики и анализа, 40 долларов почти вдвое больше 70.

Должно быть, лучше и вашим детям в чисто рублевом измерении. Сейчас, чтобы купить к осени дочери или сыну сапожки 33-го размера, нужно выложить около 1 200 000 "зайчиков". На остальные, грубо говоря, 3 500 000 — жить семьей весь сентябрь. Хорошо! Еще год назад те же сапожки стоили примерно 850 тысяч. Значит, вы стали богаче, раз ваш ребенок щеголяет в более дорогой обувке.

Не важны реальные обстоятельства вашей жизни, просто надо "правильно", то есть глазами власти, государства и его учреждений оценивать все происходящее. Не надо сопротивляться гипнозу официальных цифр и речей, и тогда вы проживете, в среднем, благополучно и счастливо, хотя, возможно, и не долго.

Людмила МАСЛЮКОВА, политический обозреватель "Народной воли".

Дажыліся!

А ў засеках — пуста

За громам пераможных лічбаў, якія так шчодра гучалі на апошнім фестывалі-ярмарцы "Дажынкі-98", неяк незаўважанымі засталіся ранейшыя вострыя праблемы вяскоўцаў. І справа не толькі ў тым, што на Віцебшчыне пасля гэтага свята ўбіраць збожжа застаецца дзесьці на 10 тысячах гектарах. Высвятляецца, што няма чаго асабліва здаваць дзяржаве, нягледзячы на пагрозлівае распараджэнне прэзідэнта аб выкананні паставак зерня на элеватары. Толькі чатыры раёны вобласці — Докшыцкі, Аршанскі, Бешанковіцкі і Шумілінскі — блізкія да таго, каб выканаць дзяржзаказ. У параўнанні з не вельмі ўдалым мінулым годам ураджайнасць скарацілася на 4,1 цэнтнера з гектара і складае пакуль 18,3 ц/га, таму ў іншых месцах проста не маюць збожжа для продажу.

Валавы недабор зерня складае сёлета ў параўнанні з леташнім 255 тысяч тон, амаль колькі раўняецца дзяржзаказ. Зразумела, можна будзе націснуць на калгаснікаў і прымусіць іх здаць апошняе збожжа, выканаць план. Але гэта толькі яшчэ больш пагоршыць бядотнае становішча большасці калгасаў і саўгасаў, якія не могуць выплаціць заробкі сваім працаўнікам у сезон найбольшага выхаду асноўнай прадукцыі.

Уладзімір ШЫК.

Хроника сражения за большую картошку

Аврал на овощных базах

Первомайский плодоовощной комбинат города Минска лично прошерстил вице-премьер Леонид Козик. Он нагрянул туда и убедился, что эта база закладывает на хранение 8 тысяч тонн картошки, 1,5 тысячи тонн свежей капусты, 1 тысячу тонн моркови, 1 тысячу тонн свеклы и прочие виды овощей и фруктов — в целом всего почти в два раза больше, чем в прошлом году. Член правительства распорядился, чтобы Мингорисполком выдал комбинату кредит деньгами для ударной закладки всего "вдвое больше". Л.Козик — человек информированный, он, может, имеет основания полагать, что приближающаяся зима для минчан (возможно, и белорусов в целом) будет не только сложной, холодной, кризисной, но и вегетарианской — вместо вздорожавшего мяса будем хрумкать морковку?

Администрация лютует

Разумеется, сражающийся за картошку глава Администрации президента Михаил Мясникович сам не копается в борозде и не таскает ведра с клубнями. Он следит за тем, чтобы за уборкой второго хлеба на Минщине неустанно следили все нижестоящие руководители и чиновники — вплоть до колхозного бригадира, который и погоняет сельчан непосредственно на поле. С этой целью В.Мясникович вызывает к себе на ковер минское городское и областное, районное начальство и делает им всем накачку. В середине сентября, например, получили взбучку руководители Заводского, Ленинского, Фрунзенского и Центрального районов столицы. Так Мясникович намерен свирепствовать до тех пор, пока на базы Минска не ляжет 35 тысяч тонн картошки.

"Капустные" деньги для народа

По слухам, в некоторых редакциях государственных газет в Доме прессы журналистам уже выдали "капустные" — деньги для закладки урожая овощей в домашние кладовки, шкафчики, банки. Это очень похоже на правду, потому что на днях Совет Министров под руководством премьера Сергея Линга принял постановление в русле этой тенденции: кто в этом году в деревнях из-за плохой погоды не сумел вырастить большой картошки, тому государство теперь даст денег. Правительство по-своему — финансами — участвует в общенародной битве.

Суммы пострадавшим от стихии (а заодно, надо полагать, и от лени и пьянства) будут выделены из госбюджета, из той его части, которая предусмотрена на ликвидацию последствий от чрезвычайных ситуаций: Брестскому и Витебскому облисполкомам — по 78 миллиардов рублей; Гомельской — 66 миллиардов, Минской — 57, Могилевской — 51, Гродненской — 20. За не выращенную крестьянами в собственном огороде бульбу держава отваливает большие деньги — не чета "капустным".

Стоп-кадр

Чем богаты — тем и рады!

Прыязджае Маскоўскі Патрыярх Алексій II

Па запрашэнні прэзідэнта краіны Аляксандра Лукашэнкі Беларусь наведае Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Алексій II. Як стала вядома БелТА, візіт Прадстаяцеля Рускай Праваслаўнай Царквы адбудзецца з 24 па 27 верасня. Гэта ўжо трэці пастырскі прыезд Яго Свяцейшаства ў нашу рэспубліку.

У першы дзень свайго знаходжання Свяцейшы Патрыярх сустрэнецца з прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам. Затым ён прыме ўдзел у царкоўных урачыстасцях, прысвечаных святкаванню Уздзвіжання Крыжа Гасподняга, якія адбудуцца ў Полацку ў Спаса-Еўфрасіннеўскім жаночым манастыры. Пасля богаслужэння Алексій II адправіць чын Уздзвіжання аднаўленага Крыжа Прападобнай ігуменні Полацкай, заступніцы Беларусі.

Гэтая святыня Праваслаўнай Царквы была створана па заказу Еўфрасінні майстрам Лазарам Богшам з выкарыстаннем старажытнавізантыйскай перагародкавай эмалі. Але ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны Крыж бясследна знік, і таму Беларуская Праваслаўная Царква прыняла рашэнне аб аднаўленні святыні. У мінулым годзе Крыж Прападобнай ігуменні быў асвячоны Мітрапалітам Мінскім і Слуцкім Філарэтам, Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі і ўрачыста ўнесены ў Полацкі Спаса-Еўфрасінеўскі манастыр.

За час знаходжання ў нашай краіне Яго Свяцейшаства наведае Мінскую, Віцебскую, Полацкую епархіі і шэраг прыходаў Беларускай Праваслаўнай Царквы.

БелТА.

"Чорны" долар

З пачатку месяца курс долара на "чорным" рынку наяўнай валюты ў Мінску ўзрос на 30 працэнтаў

На мінулым тыдні курс долара ЗША ў дачыненні да беларускага рубля ўзрос на ўсіх сегментах валютнага рынку. Найбольш прыкметна павялічыўся курс долара да безнаяўнага рубля на пазабіржавым рынку — на 48,1 працэнта (са 110.000—160.000 да 170.000 — 230.000 рублёў). На "чорным" рынку наяўнай валюты ў Мінску долар падаражэў на 17,1 працэнта (з 85.000 — 90.000 да 100.000 — 105.000 рублёў), а ў абменных пунктах камерцыйных банкаў — на 3,2 працэнта (з 64.000/64.500 — 65.000 да 66.000/66.800 — 67.000 рублёў).

На таргах мінскай Міжбанкаўскай валютнай біржы амерыканскі долар узрос за тыдзень у цане на 2,0 працэнта (з 51.200 да 52.200 рублёў), нямецкая марка — на 1,3 працэнта (з 30.400 да 30.800 рублёў), расійскі рубель — на 1,4 працэнта (з 3.500 да 3.550 рублёў). Кошт украінскай грыўны застаўся на ўзроўні 27.500 рублёў.

Напрыканцы мінулага тыдня пазабіржавы курс долара перавысіў біржавы ў 3,8 раза (на тыдзень раней — у 2,6 раза), а розніца паміж "чорным" і банкаўскім курсамі склала 53,7 працэнта (на тыдзень раней — 35,4 працэнта). З пачатку месяца пазабіржавы безнаяўны курс долара ўзрос на 73,9 працэнта, біржавы — на 4,2, "чорны" наяўны — на 29,7, банкаўскі — на 11,7 працэнта.

Афіцыйны курс долара да расійскага рубля, які ўстанаўліваецца Цэнтральным банкам РФ, узрос за тыдзень на 43,3 працэнта (з 11,4281 да 16,3818 рубля), з пачатку месяца — у 2,1 раза.

Дзмітрый УЛАСАЎ, БелаПАН.

Я думаю так

Саюз непарушны "республик славянских",

альбо Ці не занадта лёгка "вырашаюць" казённыя прапагандысты праблемы расійска-беларускіх стасункаў?

Утварэнне Саюза Расіі і Беларусі з вялікай помпаю асвятлялася ў нашай дзяржаўнай прэсе. Але розным людзям па-рознаму запомніўся дзень "великого подписания". Калі афіцыйных асоб на ўрачыстай цырымоніі частавалі шампанскім, то мітынгаваўшую апазіцыю — гумавымі дубінкамі ды штрафамі... Прайшоў час, улегліся эмоцыі, але мне і па сённяшні дзень не даюць спакою некаторыя пытанні, з вялікай лёгкасцю "вырашаныя" нашымі казённымі ідэолагамі.

Вось іх асноўныя тэзісы: маўляў, Расія ды Беларусь шмат стагоддзяў былі разам, у нас агульная гісторыя, спрадвечна брацкія стасункі, і таму мы, так бы мовіць, проста не маем права быць паасобку — дзвюм славянскім краінам наканавана уз'яднацца.

Тое, што наш край сапраўды доўга быў пад уладай магутнай суседняй дзяржавы, — чыстая праўда. Але ці з вялікай радасцю трапілі беларусы пад жалезную пяту Расійскай імперыі? Па-першае, у іх ніхто ўвогуле не пытаўся. Па-другое, сумняваюся, што ім вельмі падабаліся рэкруцкія наборы, уведзеныя на далучаных беларускіх землях, ці шалёныя падаткі, якія для нашых сялян былі ў некалькі разоў большыя, чым для рускіх, ці мэтанакіраванае знішчэнне нацыянальнай культуры, мовы... Каб зразумець глыбіню гэтай трагедыі, дастаткова прачытаць хаця б некалькі добрых сумленных кніг па гісторыі (на жаль, пасля нядоўгай выдавецкай адлігі ім зноў стала амаль што немагчыма пабачыць свет). Расійскія цары кіраваліся зусім не брацкімі пачуццямі да беларусаў, а драпежнымі імперскімі інстынктамі: напачатку праглі заваяваць землі заходніх суседзяў, сеючы там смерць ды разбурэнне, а потым — закабаліць ды асіміляваць насельнікаў нашага краю, пазбавіўшы іх гістарычнай памяці.

Шмат у чым гэтую палітыку прадоўжылі і бальшавікі. Хіба ж невядома, што на абвяшчэнне БССР яны пайшлі толькі пад націскам абставін, баючыся стварэння незалежнай ад Масквы нацыянальнай дзяржавы пад сцягам БНР? А што казаць пра жахлівыя рэпрэсіі наступных гадоў, калі былі вынішчаны ці сасланы ў ГУЛАГ самыя працавітыя сяляне, лепшыя прадстаўнікі айчыннай інтэлігенцыі? А чаго было варта кашчунскае пажаданне Хрушчова, каб беларусы першымі ў СССР выракліся роднай мовы дзеля найхутчэйшага камуністычнага зліцця нацый!

Так, нельга зацыклівацца на ранейшых крыўдах (а тым болей пераносіць іх на ўвесь рускі народ, які за сотні гадоў сам панёс страшэнныя ахвяры ад лютых рэжымаў). Але і забываць горкія ўрокі гісторыі нявартa. І тым больш — адмаўляцца ад унікальнага шанцу пабудаваць незалежную беларускую дзяржаву (якой, безумоўна, не зашкодзяць добрыя, цесныя стасункі з усходняй суседкай).

Дарэчы, асобна хацелася б спыніцца на прапагандысцкім тэзісе пра "две славянские страны". Ну добра, на Беларусі сапраўды жывуць пераважна славяне. Але ж гэта не падстава лічыць, да прыкладу, літоўцаў ці яўрэяў грамадзянамі другога гатунку. А што ўжо казаць пра Расію? У яе складзе, як вядома, цэлы шэраг аўтаномій, сярод якіх і Дагестан, і Калмыкія, і Якуція, і тая ж Чэчня — рэспублікі, якія далёка не лічаць сябе славянскімі. Мяркую, што называць Расію славянскай краінай — значыць, абражаць дзесяткі народаў, якія насяляюць яе абсягі. Скажу нават больш рэзка: тут патыхае ўжо звычайным расізмам! Дарэчы, ці падумаў, напрыклад, вялікі энтузіяст "аб'яднання славянскіх народаў" Аман Тулееў, што ў такім разе яго ўласнае паходжанне можа выклікаць пэўныя пытанні ў якога-небудзь апантанага змагара за "веліч славянскай расы"?

Відавочна, што вядомыя веснавыя пагадненні, у якіх пераважае абстрактная дэкларыйнасць, далёка не расставілі кропкі над "і" ў няпростым пытанні расійска-беларускіх адносін. І да тэмы Саюза грамадскасць дзвюх краін будзе вяртацца яшчэ неаднойчы.

Пэўныя ж сілы з абодвух бакоў паспрабуюць і надалей скарыстоўваць сапраўды надзённую праблему больш плённага супрацоўніцтва між краінамі-суседкамі для несумленных, карыслівых палітычных гульняў. Так што пасля цяперашняга ахаладжэння стасункаў паміж Масквой і Мінскам зусім верагодны новы віток аб'яднаўчай рыторыкі. Па-першае, Беларусь застаецца для Расіі надзвычай важным стратэгічным плацдармам. Па-другое, сюды рвецца нахрапісты расійскі бізнес. Па-трэцяе: а раптам спадар Ельцын усё ж надумае яшчэ на адзін тэрмін сесці ў крэсла прэзідэнта — толькі ўжо аб'яднанай дзяржавы? Свае планы на гэты конт могуць быць і ў Мінска...

У любым выпадку важна не паддавацца прапагандысцкаму псіхозу, а цвяроза, на падставе гістарычнага вопыту, асэнсаваць магчымыя наступствы. Каб не давялося потым сёрбаць горкую кашу, завараную палітыканамі.

Вольга КЛАСКОЎСКАЯ.

Из первых уст

У Объединенной гражданской партии есть программа выхода Беларуси из кризиса

Одним из самых известных белорусских политиков сейчас, безусловно, является Станислав БОГДАНКЕВИЧ. О том, почему и как он попал в водоворот политических страстей, как видит нынешнюю ситуацию в Беларуси и ее перспективы, Станислав Антонович рассказывает в беседе с журналистом Владимиром ГЛОДОМ.

— Итак, Станислав Антонович, хотя Вы человек известный, но не помешает напомнить читателям о Вашем жизненном пути...

— Я родился в 1937 году в семье, где было пятеро детей. Белорус. Получив аттестат зрелости, поступил в Пинский учетно-кредитный техникум, затем заочно окончил финансово-экономический институт в Москве. После техникума работал в системе Государственного банка в Беларуси, причем прошел путь от рядового инспектора до руководителя областного и республиканского учреждения банка. Со временем защитил сначала кандидатскую, затем докторскую диссертации. Десять лет работал заведующим кафедры денежного обращения и кредита Белорусского института народного хозяйства. Более четырех лет был председателем правления Национального банка Беларуси. Стажировался в Национальных банках Франции и Англии. Автор более 200 научных трудов, в том числе монографий и книг. Действительный член трех международных академий. Своими главными достижениями в жизни считаю разработку национального банковского законодательства, формирование устойчивой двухуровневой банковской системы, введение (1994 г.) национальной валюты, ее стабилизацию (1995 г.) и обеспечение цивилизованного валютного рынка, впоследствии разрушенного невежественными политиками.

— Как произошло, что Вы стали председателем Объединенной гражданской партии?

— На первых президентских выборах я поддерживал Станислава Шушкевича. После прихода к власти Александр Лукашенко пригласил меня для беседы. Мы встречались несколько раз и договорились: если президент возьмет курс на рыночные преобразования, на создание цивилизованного общества, я готов добросовестно трудиться вместе с ним ради всего белорусского народа. Не хочу показаться хвастливым, но при моем активном участии была разработана первоочередная программа рыночных преобразований, одобренная как президентом, так и Верховным Советом. В части, относящейся к Национальному банку, она была выполнена: белорусский рубль превратился в ограниченно конвертируемую, признанную Россией и странами СНГ валюту. Она использовалась в межгосударственных расчетах, имела стабильный обменный курс. Благодаря положительной ставке была обеспечена сохранность сбережений населения в белорусских рублях. В то же время в части, относящейся к исполнительной власти, программа была почти полностью провалена. А.Лукашенко шаг за шагом отходил от первоначально согласованной экономической политики, избрал полностью бесперспективный курс на возврат к административно-командной модели хозяйствования, отказался от давно назревших реформ, в нарушение Конституции установил режим личной власти. Это и привело к моему отказу от сотрудничества с Лукашенко и отставке.

В этих условиях только сильный парламент мог предотвратить экономический крах, к которому вел страну А.Лукашенко. Как раз назревали выборы в Верховный Совет. Накануне выборной кампании состоялся объединительный съезд Объединенной демократической и Гражданской партий, который избрал меня председателем Объединенной гражданской партии (ОГП). Чего мы достигли? Семнадцать членов ОГП являются депутатами Верховного Совета 13-го созыва, а парламентская фракция "Гражданское действие" стала одной из самых интеллектуальных и авторитетных и состоит сегодня из 21 депутата. В ноябре 1995 года более 30 кандидатов от партии завоевали первые места в своих округах на довыборах в Верховный Совет Республики Беларусь. Мы шли к тому, что численный состав фракции и ее политический вес был бы более чем удвоен. Власти этого испугались. Как известно, Лукашенко неправомерно отменил итоги народного голосования, нарушив волю избирателей и законы страны. Таковы факты, и у меня нет сомнений, что к ним мы еще не раз вернемся.

— Станислав Антонович, ситуация в Беларуси из года в год ухудшается. В последнее время особенно стремительно. Причем уже все понимают, что самое худшее ждет нас впереди. Глубина пропасти, в которую падает Беларусь под руководством ее безграмотного президента, просто страшна. Какой выход видит Ваша партия из сложившейся ситуации?

— Беларусь доведена до глубокого кризиса, находится в социально-экономическом тупике и международной изоляции. В стране не функционирует всенародно избранный парламент, нет самостоятельной судебной власти, ликвидировано местное самоуправление, "прихватизированы" телевидение, радио и массовые государственные газеты. Уровень заработной платы и пенсий в несколько раз ниже, чем в соседних Польше, Литве и даже России. Реальные денежные сбережения населения, с учетом инфляции, нулевые. Износ оборудования равен 85—90 процентам, а инвестиции в целом составляют лишь половину от начисленной амортизации. Бегство из страны капитала усилилось, притока иностранного капитала нет. Страна вновь на пороге гиперинфляции, в прошлом году рубль по отношению к доллару обесценился в два раза, в текущем уже почти в три раза. Рентабельность экономики крайне низка и продолжает падать.

Но безвыходных ситуаций, как известно, не бывает. Выход из политического и социально-экономического кризиса в сложившихся условиях возможен через отстранение от власти группы Лукашенко посредством победы на предстоящих выборах в местные Советы и выборах президента. *Для этого как минимум народу Беларуси должна быть предоставлена возможность через телевидение познакомиться с Программами выхода из кризиса, имеющимися у демократических сил, узнать о наличии у них достойных политиков и государственных деятелей, способных сделать страну процветающей, осознанно сменить диктатуру на подотчетную себе власть. При этом важнейшей задачей является недопущение фальсификации результатов голосования.* Для этого избирательные комиссии, от центральной до участковой, должны включать в себя как сторонников, так и противников президента, а наблюдателям за выборами должны быть предоставлены широкие возможности контроля за недопущением фальсификации выборов.

(Окончание на 2-й стр.)

На дискуссионном ринге

Белорусская ассоциация молодых политиков совместно с Минским международным образовательным центром проводит постоянно действующий Полемико-дискуссионный ринг, который сами организаторы кратко и энергично называют ПолДиРинг. В очередной раз на интеллектуальное состязание участники соберутся 25 сентября, чтобы провести дискуссию на тему "Белорусские СМИ: реалии и перспективы развития". К диалогу приглашены председатель Госкомитета по печати М.Подгайный, начальник главного управления общественно-политической информации Администрации президента А.Соломаха, руководитель Белорусской ассоциации журналистов Ж.Литвина, журналист А.Федута. "Рефери" на "ринге" будет журналист Ольга Короткевич. В работе "круглого стола" примут участие более двадцати молодежных организаций Беларуси.

А.ЦЫНКЕВИЧ.

Злачынная групоўка абясшкоджана

Супрацоўнікамі ўпраўлення па Гомельскай вобласці па арганізаванай злачыннасці і карупцыі пры МУС і АМАПа абясшкоджана арганізаваная злачынная групоўка, якая займалася рабаваннем аўтамабіляў.

Затрымана пяць чалавек, прычым адзін з іх — грамадзянін Расіі, якія кантралявалі мясцовы ўчастак аўтамабільнай трасы Санкт-Пецярбург — Краснадар. Рабаўнікі папаліся з доказамі злачынства: на момант "апрацоўкі" расійскага КамАЗа, у вадзіцеляў якога яны пад пагрозай фізічнай расправы выкралі 4 млн. 500 расійскіх рублёў і 5 млн. рублёў беларускіх.

Узбуджана крымінальная справа, вядзецца следства.

Ірына МАКАВЕЦКАЯ, БелаПАН.

Надвор'е

23 і 24 верасня на тэрыторыі рэспублікі — пераменная воблачнасць, пераважна без ападкаў, толькі 23-га ўначы на паўночным усходзе пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах — туман. Вецер паўночны, 4—9 м/с, удзень парывы да 12—14 м/с. Тэмпература паветра ўначы +3...+8, 24-га месцамі замаразкі да 0...-2; удзень — +13...+18.

Из первых уст

У Объединенной гражданской партии есть программа выхода Беларуси из кризиса

(Окончание. Начало на 1-й стр.)

Демократический избранный президент, опираясь на волю своих избирателей, восстановит в стране Конституцию Республики Беларусь 1994 года, совместно с Верховным Советом проведет свободные перевыборы парламента страны, а также прямые выборы населением глав местных администраций вместо нынешних "вертикальщиков".

— Есть ли у Объединенной гражданской партии силы самой решить эти задачи?

— Безусловно, ведь наша партия по своему составу самая элитарная — в ней более 100 кандидатов и докторов наук, немало толковых экс-министров, других крупных госчиновников, руководителей предприятий и концернов, а также деятелей народного образования и культуры. Она располагает сильной экономической программой. Однако в одиночку, без объединения всех демократических сил решение такой сложнейшей задачи весьма проблематично. Объединенная гражданская партия инициировала идею создания единого Избирательного демократического блока, выдвижения единой кандидатуры на президентских выборах на базе согласованной платформы и программы. Прежде всего крайне желательно объединение ведущих демократических партий: БНФ, партий социал-демократической ориентации, нашей.

— А почему, на Ваш взгляд, так тяжело идет консолидация демократических сил?

— Главные трудности — субъективного плана. Это амбициозность отдельных партийных лидеров, попытки считать собственные представления истиной в последней инстанции, завышенная самооценка своих политических возможностей, к сожалению, превалирование партийных либо идеологических представлений и интересов над интересами страны. Схоластические споры о формах власти в Беларуси (президентской или парламентской), степени влияния на страну имперских сил России, о том, на каком языке обязан разговаривать белорусский народ, какая из партий является самой национальной и выражающей его глубинные интересы, и тому подобное в условиях господства диктаторского режима и экономического краха представляются вторичными. Главное — восстановление в стране конституционной законности и демократии, свободы СМИ, проведение экономических преобразований, способных поднять уровень жизни народа.

Поэтому мы просто обязаны во имя народа, демократии и процветания прийти к согласию, выработать общую платформу и программу и поддержать на президентских выборах единого кандидата от демократических сил. Иного история нам не простит.

Большой вред делу консолидации демократических сил наносят деятели, занимающиеся различными провокациями, всевозможными измышлениями о позиции и "тайных помыслах" своих, казалось бы, естественных союзников. Они дают безапелляционные, почти такие же, как г-н Лукашенко и его "зимовские", оценки своим коллегам из других партий. Например, чего только нет в статье члена ЦК БСДП А.Сидоревича, опубликованной в "Народной воле" от 1 сентября 1998 года. Например, в первой части этой статьи утверждается, что у Объединенной гражданской партии "будет по меньшей мере два претендента" на должность президента, однако далее говорится о "фальстарте" ОГП, которая будто бы поспешила с выдвижением кандидата (одного, а не двух) для согласования с другими партиями в качестве общего кандидата демократических сил. 76 процентов участников заседания Национального комитета нашей партии, высказавшиеся в поддержку кандидатуры Карпенко, по мнению Сидоревича, являются "неубедительным большинством". Любому мало-мальски здравомыслящему политику ясно, что в условиях информационной блокады ошибкой ОГП, как и всей демократической оппозиции, является не торопливость, "фальстарт" с выдвижением кандидата в президенты, а "опаздывание" партий, отсутствие у широкой общественности всяких представлений о возможных альтернативах Лукашенко. Или просто склочное, основанное на домыслах обвинение Национального исполнительного комитета в том, что он опубликовал в качестве Концепции экономических реформ экономическую программу нашей партии. В действительности эта Концепция многократно обсуждалась с руководством БСДГ, имеются письменные замечания, которые при моем личном участии были обсуждены и включены в Концепцию в полном объеме. Наконец, по поручению г-на Статкевича, лидера партии, в которую входит упомянутый автор, депутат Верховного Совета от социал-демократической группы Владимир Баширимов участвовал в экспертизе и разработке этого документа. Непорядочно все это.

— Ваше мнение о предстоящих в 1999 году выборах президента республики?

— У меня нет стопроцентной уверенности, что выборы президента состоятся в конституционные сроки. А.Лукашенко боится честных выборов. Однако выборы в те либо иные сроки состоятся. И к ним необходимо готовиться. Меня не оставляет убеждение, что белорусский народ способен отличить популиста и демагога от профессионала и прагматика, что он в своем большинстве понимает зависимость между своим обнищанием и невежественным правлением Лукашенко. И что более такой ошибки не повторит. Считаю, что победа Лукашенко на новых выборах возможна только посредством крупной фальсификации. Объединенная оппозиция при поддержке международной общественности такой фальсификации способна не допустить. В противном случае выборы не будут признаны легитимными.

— Почему Объединенная гражданская партия остановила свой выбор на Геннадии Карпенко?

— Объединенную гражданскую партию многие называют "звездной". Действительно, в ее руководстве находятся такие известные и авторитетные в стране политики, как Карпенко, Гончар, Шлындиков, Захаренко, Климов, Добровольский, Лебедько, Данейко, Соснов, Грязнова, Корниенко, Кацора, Левашевский и другие. Национальный комитет ОГП предложил рассмотреть кандидатуру Геннадия Карпенко в качестве единого кандидата от демократических сил прежде всего потому, что эта кандидатура является подлинной альтернативой Лукашенко. В отличие от политрука и деятелей колхозно-совхозного уровня наш претендент представляет собой иной, более высокий уровень государственного руководства. За плечами у Г.Карпенко работа в должности директора крупного завода, государственная служба в качестве руководителя исполкома Молодечно, а также заместителя председателя Верховного Совета Республики Беларусь. Он один из немногих, кто избирался в парламент дважды — в двенадцатом и тринадцатом созывах. Признанием эффективности работы Г.Карпенко является присуждение ему звания лауреата Государственной премии. Он — доктор наук и член-корреспондент Национальной академии. Кроме того, Национальный комитет исходил из приемлемости выдвигаемой кандидатуры для наших ближайших союзников по борьбе с тоталитарным режимом: БНФ и СДП "Народная грамада", а также депутатов Верховного Совета. Против этой кандидатуры нет возражений в высшем руководстве этих партий, хотя окончательного решения все еще не принято. Немаловажно и то, что Г.Карпенко не относится к так называемым харизматическим лидерам. Геннадий Дмитриевич — представитель команды профессионалов, способных предложить стране новый курс. В этой команде есть место всем государственным деятелям независимо от их партийной принадлежности, стоящим на позиции безусловного обеспечения прав и свобод человека, независимости и суверенитета страны, демократии, восстановления Конституции 1994 года, перехода к социально ориентированной рыночной экономике.

— По результатам социологических опросов Вы сами постоянно находитесь в первой пятерке ведущих политиков страны. Что Вы могли бы сказать тем людям, которые хотели бы видеть именно Вас в качестве президента страны?

— Как политик и экономист, я весьма признателен этим людям за доверие и поддержку. Для меня это особенно важно в свете той грязи, распространенной по телевидению, СМИ, которую вылили на меня Лукашенко и его холуи после моей отставки по принципиальным мотивам с поста председателя правления Национального банка. Расследование, проведенное прокуратурой Республики Беларусь, отмело все эти обвинения как не соответствующие действительности. Более того, отдельные инициаторы измышлений в мой адрес после временного возвышения оказались в следственном изоляторе. Однако населению об этом мало что известно. Вы же прекрасно знаете, Лукашенко никогда не признавался в своих ошибках. А его подручные из государственных СМИ попросту юлят и выкручиваются. Я обращался к главному редактору газеты, которая меня оклеветала, напечатав огромный материал о моих якобы страшных грехах. Спрашиваю: почему Вы не печатаете результаты расследования прокуратуры, нельзя же так. В ответ слышу: мы перепечатали интервью, подготовленное агентством "Интерфакс". Растиражировали на всю Беларусь ложь, а потом умывают руки, хотя на словах и сочувствуют тебе. Разве так можно?

Разумеется, я хотел бы использовать свои знания и опыт на благо страны. Прежде всего как профессиональный экономист. К сожалению, сегодня я не могу работать даже в государственном вузе, хотя являюсь профессором и доктором экономики. Что касается президента, то я считаю сегодня наиболее приемлемым и проходным кандидатом на этот пост из всех известных мне претендентов Геннадия Карпенко. Потому и являюсь одним из инициаторов его выдвижения.

Тем же, кто мне не доверяет, я хотел бы пожелать благосостояния и удачи в условиях жизни, достигнутых при Лукашенко.

Стоп-кадр



Всю жизнь — на коне

Дед Люлюк, как в деревне Бермуты Березовского района называют Ивана Николаевича Вечерко, все войны, которые выпали на его долю за 85 лет, прошел в кавалерии. А после последней, Отечественной, когда восстанавливали животноводство, пришлось поработать в родном колхозе конюхом. И сейчас заслуженный пенсионер не расстается со своей кобылой Сивкой, иногда может даже погарцевать на ней перед односельчанами.

Фото Романа КОБЯКА, БелТА.

Задумаемся...

Што сказаў бы граф Агінскі, калі б падняўся з магілы і паглядзеў на той парк, які некалі заснаваў?

Недалёка ад Пінска, каля вёскі Дубай, знаходзіцца старажытны парк прыроды — "Парк Дубай", заснаваны яшчэ ў сярэдзіне XVIII стагоддзя гетманам Вялікага княства Літоўскага графам Міхалам Агінскім. Пасля падарожжа па Палессі вялікі беларускі пісьменнік Уладзімір Караткевіч пісаў: "Парк у Дубае! І дагэтуль ідылія і сляды парадку, ранейшай гармоніі".

Жывучы ў Слоніме, граф Агінскі заснаваў там оперны тэатр, капэлу, а таксама друкарню і некалькі прамысловых прадпрыемстваў. Акрамя ўсяго гэтага, граф Агінскі напэўна меў добрыя веды ў галіне гідратэхнікі, бо створаны пад ягоным кіраўніцтвам парк меў унікальную водную сістэму, якая больш нідзе на Беларусі не сустракаецца. Водныя каналы дзялілі парк на шэсць выспаў, злучаных паміж сабой арыгінальнымі драўлянымі масткамі. У цэнтры парка знаходзілася сажалка з дзіўным фантанам, які функцыянаваў дзякуючы адмыслова створанай сістэме перападаў вады. На тэрыторыі парку месціліся таксама палац і касцёл. У розныя часы парк належаў такім вядомым людзям, як канцлер Вялікага княства Літоўскага Альбрэхт Радзівіл і браты Агінскія. Парк наведвалі таксама кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст, вядомы пісьменнік і дзеяч Адам Нарушэвіч і шмат іншых.

Цяпер парк знаходзіцца ў жахлівым стане. Адразу пасля вайны на яго тэрыторыі пабудавалі некалькі сялянскіх хат. Недагледжаныя сажалкі амаль поўнасцю зараслі цінай; масткі, што некалі іх злучалі, ператварыліся ў гнілыя абломкі. Дзяржаве няма да гэтага справы. Толькі час ад часу сябры дэмакратычных арганізацый горада спрабуюць аказаць парку пасільную дапамогу. Вось і нядаўна дванаццаць сяброў пінскай маладзёжнай культурна-асветніцкай арганізацыі "МРОЯ", нягледзячы на неспрыяльнае дажджлівае надвор'е, паехалі на тры дні ў "Парк Дубай", каб дагледзець вайсковыя могілкі часоў першай сусветнай вайны. На могілках, якія месцяцца на тэрыторыі парку, знайшлі свой апошні прытулак нямецкія, польскія ды расійскія салдаты. Як мне расказаў адзін з кіраўнікоў "МРОІ" Сяржук Мацукевіч, магілы можна было знайсці толькі па надгробных плітах, якія калі не паўрасталі цалкам у зямлю, то шчыльна пакрыліся імхом ды травой. На некаторых з іх нават удалося часткова аднавіць надпісы.

Акрамя могілак, мроеўцы ачысцілі таксама закінуты касцёл і праход да яго, які быў завалены выкарчаванымі падчас апошняга ўрагану дрэвамі ды галлём. "Каб вывезці за межы парку увесь мох з могілак ды галлё з касцёлу, нам спатрэбілася тры трактарных прычэпы", — кажуць сябры "МРОІ". Сапраўды, калі паглядзець на здымкі, якія былі зроблены на месцы працы, можна ўбачыць, што тры дні руплівай працы не прайшлі дарма. На маё пытанне, чаму сябры "МРОІ" вырашылі ўзяцца менавіта за гэтую справу, Сяржук Мацукевіч адказаў: "Акрамя ўсяго іншага, мы зрабілі гэта дзеля таго, каб звярнуць увагу сучаснай моладзі на праблемы сваёй гісторыі, гісторыі свайго роднага краю. Мы хочам, каб нашыя сучаснікі зразумелі, што калі за аднаўленне помнікаў нашай гісторыі не возьмецца моладзь, то гэтага ніхто іншы не зробіць, і хутка шмат якія гістарычныя помнікі ўвогуле знікнуць назаўсёды".

Мясцовыя жыхары кажуць, што, па паданні, недзе ў парку закапаны меч мужнага рыцара, які ў неабходны момант прыйдзе за ім, каб абараніць родную зямлю. Напэўна, момант ужо прыйшоў.

Аляксей ДЗІКАВІЦКІ.

У Купалаўскім тэатры кіпяць прэм'ерныя страсці

1 кастрычніка Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы адкрывае свой тэатральны сезон. Праўда, не знакамітай камедыяй "Паўлінка", як звычайна, а не менш папулярнымі легендамі сівой даўніны — "Князем Вітаўтам". Як тлумачыць дырэктар тэатра Генадзь Давыдзька, дарагая публіцы і акцёрам "Паўлінка" у бліжэйшай будучыні набудзе "музейна-сувенірны" выгляд. Бо ў абноўленым варыянце спектакля будуць і саматканыя касцюмы, і ўражлівае сцэнічнае аздабленне, і даволі адметны рэквізіт. Між іншым, мяркуецца, што ў хуткім часе купалаўскую "Паўлінку" ўключаць у экскурсійныя праграмы для замежных турыстаў.

Дарэчы, 8, 9 і 10 кастрычніка на сцэне купалаўскага тэатра адбудзецца прэм'ера: спектакль "Вечны Фама" па п'есе У.Бутрамеева паводле "Сяла Сцяпанчыкава і ягоных жыхароў" Ф.Дастаеўскага.

Але "Вечны Фама" — не адзіная прэм'ера купалаўцаў у гэтым тэатральным сезоне. Сёлета сваім гледачам тэатр прапануе таксама "Народны альбом" Анемпадзістава, "Тут жывуць людзі" Фугарда, "Піраміда Хеопса" Ломаўцава, "Сон у Іванаву ноч" Шэкспіра, "Вясёленькі тыдзень для пікніка" Уільямса і "Дзікае паляванне караля Стаха" Караткевіча.

Марына ВІШНЕЎСКАЯ.

Здарэнні

Бульбяную зладзейку распранулі да трусоў

Надта здзівіліся ў Аршанскім райаддзеле міліцыі, калі ўзбуджаныя грамадзяне даставілі да іх у адных трусах добра знаёмую, раней судзімую грамадзянку К. Працы іх падапечная не мела, а вырашыла пажывіцца бульбачкай на адным з дачных участкаў паблізу вёскі Цяглава. Але, на сваю бяду, жанчына была заўважана гаспадыняй агарода, якая ў апошні момант вырашыла сюды вярнуцца. Абураная ўладальніца ўчастка паклікала для расправы суседзяў. Пасля збіцця зладзейкі людзі рашылі распрануць крыўдзіцельніцу і ў такім выглядзе здаць яе ў міліцыю.

Сёлета ўраджай "другога хлеба" многіх гаспадароў зноў падвёў, і зараз ужо кілаграм бульбачкі каштуе на рынку ад 10 да 16 тысяч рублёў. Па апошнім трагікамічным здарэнні ўзбуджана крымінальная справа, бо ўрон для гаспадыні ўчастка ацэнены ў 900 тысяч рублёў. Пры цяперашніх цэнах традыцыйны раней прадукт на стале беларусаў становіцца для многіх сем'яў недасягальным, і сумна, што дабыць бульбу асобныя могуць толькі крымінальным чынам.

Уладзімір ШЫТАЎ.

Знаете ли вы?

